# ФАКТ У НАВУКОВАЙ ПУБЛІЦЫСТЫЦЫ: АСАБЛІВАСЦІ ФУНКЦЫЯНАВАННЯ

***С. В. Зелянко***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*siarhejzelianko@gmail.com*

У артыкуле разглядаюцца асаблівасці выкарыстанняя фактычнай інфармацыі і яе вербальнага ўвасаблення ў навуковым і публіцыстычным дыскурсах. Аналізуюцца функцыянальныя адрозненні ўключэння фактаў у навуковыя і навукова-публіцыстычныя тэксты. Вывучаюцца жанравыя адрозненні навуковых і навукова-папулярных публікацый, прысвечаных вынаходніцтву, тэсціраванню і прымяненню вакцын, здольных выклікаць фарміраванне набытага ўстойлівага імунітэту супраць новай каранавіруснай інфекцыі COVID-19.

***Ключавыя словы:*** факт; навуковая публіцыстыка; навуковы дыскурс; публіцыстычны дыскурс.

# FACT IN SCIENTIFIC JOURNALISM: FEATURES OF FUNCTIONING

***S. V. Zelianko***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: S. V. Zelianko (siarhejzelianko@gmail.com)*

The article considers the peculiarities of the use of factual information and its verbal embodiment in scientific and journalistic discourses. The functional differences of the inclusion of facts in scientific and scientific-journalistic texts are analyzed. The paper studies genre differences between scientific and popular science publications on the invention, testing and use of vaccines capable of inducing the development of acquired stable immunity against the new coronavirus infection COVID-19.

***Key words:*** fact; scientific journalism; scientific discourse; journalistic discourse.

У навуковым дыскурсе галоўнае прызначэнне фактычнай інфармацыі – гэта выкананне функцыі несупрэчлівага, дасканалага і лагічнага абгрунтавання ўласнай пазіцыі даследчыка ў той ці іншай галіне ведаў. Менавіта падобнае разуменне паняцця *факт* дазваляе разглядаць яго ў якасці доказу, сістэмы высноў, «што служыць для ўстанаўлення новага палажэння на падставе іншых, раней вядомых, даказаных, сапраўднасць якіх не выклікае сумнення» [1, с. 83]. Пры гэтым у пісьмовым і вусным навуковым маўленні факт можа выкарыстоўвацца і для падстаўнага абвяржэння раней вылучаных навуковых гіпотэз (як уласных ідэй пэўнага вучонага, так і чужых), што існавалі ў навуковым дыскурсе да атрымання найноўшых факталагічных звестак, якія даказваюць несапраўднасць, недасканаласць і хібнасць папярэдніх тэарэтыка-метадалагічных палажэнняў. Яскравым прыкладам падобнага выкарыстання фактаў у навуковым дыскурсе з’яўляецца эмпірычна доказнае вытлумачэнне геліяцэнтрычнай сістэмы Сусвету і адвяржэнне ўяўленняў аб тым, што планеты, Сонца і Месяц рухаюцца вакол Зямлі. Падобнае ж выкарыстанне фактаў у якасці доказаў безгрунтоўнасці палажэнняў пэўных вучэнняў, псеўданавуковых дактрын і канцэпцый знаходзім у крытыцы астралогіі, нумералогіі, этнічна-расавых тэорый, састарэлых уяўленняў у галіне фізікі (можна згадаць тэорыю эфіру, спробы вынаходніцтва вечнага рухавіка), хіміі (алхімічныя эксперыменты з філасофскім каменем і атрыманнем золата з іншых элементаў), геаграфіі (уяўленні аб дыскападобнай форме планеты Зямля) і іншых навук.

У адрозненне ад навуковага тэксту, факт у журналістыцы (і ў першую чаргу гэта тычыцца навуковай публіцыстыкі) акрамя відавочнай доказна-абвяргальнай функцыі можа выконваць функцыю рытарычную, г. зн. «гаварыць» сам за сябе, станавіцца асобным прадметам публікацыі, быць тэматычным стрыжнем медыяпаведамлення. З гэтага гледжання факт становіцца роўным *навіне* як адной з самых значных адзінак медыядыскурсу, якая здольная ў сабе ўвасабляць і адначасова адлюстроўваць у публіцыстычным маўленні элементы іншых дыскурсаў (сацыяльнага, гістарычнага, навуковага і да т. п.). Безумоўна, і ў навуковым тэксце асобны факт можа з’яўляцца асновай публікацыі, аднак менавіта ў публіцыстыцы гэтая функцыя выражаецца найбольш яскрава і відавочна. Гэтае палажэнне вынікае з таго, што для аўдыторыі, на якую накіраваны навуковы тэкст, акрамя самога факта высокую значнасць будуць мець і доказы, вынікі эксперыментаў, тэарэтычныя выкладкі, што абгрунтоўваюць і пацвярджаюць факт, паколькі,

як сцвярджае прафесар С. А. Лебедзеў, «прынцыповым аказваецца прызнанне сацыяльнага характару навуковага пазнання, сапраўдным суб’ектам якога з’яўляецца не асобны вучоны, а навуковы калектыў і перш за ўсё адпаведная дысцыплінарная навуковая супольнасць. У канчатковым рахунку, перавага той ці іншай канцэпцыі аказваецца вынікам навуковых камунікацый паміж членамі навуковай супольнасці, часам драматычных навуковых дыскусій і “перамоваў” яе ўдзельнікаў (падчас крытыкі, у выніку ўплыву навуковых аўтарытэтаў, традыцый, школ, ацэнкі практычнай значнасці канцэпцыі і г. д.)» [2, с. 131–132]. Такім чынам, прызнанне асобнага факта навуковай супольнасцю, магчымасць яго верыфікацыі іншымі даследчыкамі, праверка ўзнаўляльнасці факта, яго «аналіз, супастаўленне, сістэматызацыя, абстрагаванне, мадэляванне» [3, с. 7] з’яўляюцца неабходнымі і даволі значнымі фактарамі функцыянавання фактычнай інфармацыі ў навуковым дыскурсе. Пры гэтым для ўспрымальнікаў (навукова-)публіцыстычнага тэксту факт можа быць цікавым і без яго тэарэтычнага вытлумачэння, дэталёвых апісанняў вынікаў эмпірычных даследаванняў, аналізаў, замераў і г. д.

Да месца тут будзе прывесці прыклад з асвятленнем у навуковым і публіцыстычным дыскурсах вынаходніцтва шэрагу вакцын, здольных выклікаць фарміраванне набытага ўстойлівага імунітэту супраць новай каранавіруснай інфекцыі COVID-19.

Так, у навуковым дыскурсе ключавым жанрам паведамленняў аб вакцынах супраць каранавіруса з’яўляецца рэцэнзаваны аналітычны, навукова-практычны, навукова-тэарэтычны ці навукова-даследчы артыкул. Гэта зразумела, паколькі менавіта ў гэтым жанры даследчыкі маюць магчымасць прывесці вынікі навуковых эксперыментаў і тэстаў, прадэманстраваць навуковай грамадскасці эмпірычна даказаныя звесткі, адлюстраваць прамежкавыя высновы, разгорнута выказаць меркаванні. Паступова, калі на фармакалагічным рынку з’явіліся вакцыны некалькіх распрацоўчыкаў, у навуковым дыскурсе можна было адзначыць наяўнасць навуковых аглядаў у выглядзе артыкулаў, у якіх староннія даследчыкі (напрамую не звязаныя з пэўнай фармакалагічнай карпарацыяй) аналізавалі перавагі і недахопы супрацькавідных вакцын.

У медыядыскурсе назіраецца большая жанравая разнастайнасць публікацый аб вынаходніцтве, эксперыментах і выпрабаваннях вакцын супраць інфекцыі COVID-19. Безумоўна, перавага ў колькасным вымярэнні публікацый, прысвечаных супрацькавідным вакцынам, як і ў навуковым дыскурсе, належыць жанру артыкула. Аднак у

публіцыстычным дыскурсе, у адрозненне ад навуковага, відавая дыферэнцыяцыя артыкулаў іншая. Так, у друкаваных СМІ знаходзім тэарэтыка- і практыка-аналітычныя, рэкламна-прапагандысцкія, навукова-папулярныя, інфармацыйныя і аглядныя артыкулы, прысвечаныя праблематыцы вынаходніцтва, тэставання і прымянення супрацькавідных вакцын. Акрамя таго, у медыядыскурсе значная колькасць публікацый па азначанай праблематыцы прадстаўлена ў розных відах жанру нататкі. Таксама ў друкаваных СМІ наяўнічаюць іншыя жанравыя формы (і іх відавыя варыяцыі) прад’яўлення масавай аўдыторыі інфармацыі аб вакцынах супраць новай каранавіруснай інфекцыі COVID-19: інтэрв’ю, справаздача, рэпартаж, каментар і агляд.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Зелянко С. В.* Методыка рэдагавання: вучэб.-метад. комплекс. Мінск: БДУ, 2017. 88 с.
2. *Лебедев С. А.* Проблема истины в науке // Человек. 2014. № 4. С. 123–135.
3. *Ивченков В. И.* Создание научного текста через призму дискурсного анализа // Народная асвета. 2021. № 2. С. 7–9.